## Раздзел 3
# ВІЗУАЛЬНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ ЯК НАПРАМАК НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

УДК 572+316.7-028.22

**А. Д. Крывалап,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*

## ВІЗУАЛЬНЫ ПАВАРОТ І КУЛЬТУРНАЯ АНТРАПАЛОГІЯ

Тэкст прысвечаны разгляду з'явы візуальнага павароту ў еўрапейскай культуры XX ст., а таксама магчымасці вывучэння візуальнай культуры як асобнай сферы даследаванняў. Разглядаюцца магчымасці і цяжкасці пабудовы асобнай метадалогіі для даследавання візуальнай культуры. У артыкуле разглядаюцца працы такіх даследчыкаў, як Д. Бахман-Медык, В. Беньямін, У. Мітчэл, Б. Сарасваці, Дж. Элкінс. Дадзены тэкст імкнецца ў першым набліжэнні акрэсліць магчымасці выкарыстання візуальнай антрапалогіі.

**Ключавыя словы:** візуальная культура, візуальная антрапалогія, візуальны паварот.

***A. D. Kryvalap,***
*Candidate of Cultural Studies, Associate Professor of the Department of Cultural Studies of the Educational Institution "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# VISUAL TURN AND CULTURAL ANTHROPOLOGY

The text is devoted to the consideration of the visual turn phenomenon in European culture of the 20th century, as well as the possibility of studying visual culture as a separate field of research. The possibilities and difficulties of creating a separate methodology for the study of visual culture are considered. The article examines the works of such researchers as D. Bachmann-Medic, W. Benjamin, W. Mitchell, B. Saraswati, J. Elkins. This text in a first approximation aims to outline the possibilities of using visual anthropology.

**Key words:** visual culture, visual anthropology, visual turn.

Візуальная культура і яе вывучэнне ў другой палове XX ст. атрымалі статус самастойнай даследчай вобласці. Можна сказаць, што гэтаму спрыяў так званы іканічны ці візуальны паварот. Шэраг паваротаў у вывучэнні культуры, якія адбыліся ў XX ст., прывялі да таго, каб перафарматаваць разуменне культуры. Нямецкая даследчыца Д. Бахман-Медык [1] выбудоўвае лагічную серыю паваротаў у вывучэнні культуры: лінгвістычны, інтэрпрэтацыйны, іканічны і інш. Але дадзены тэкст прысвечаны візуальнасці і антрапалогіі, таму падрабязна спынімся менавіта на тым, што называецца візуальным паваротам.

Візуальны паварот вельмі заўважны ў гісторыі мастацтваў, але не абмяжоўваецца ёй. Гэта не проста гісторыя мастацтва, імёны творцаў, прыналежнасць да школы, выкарыстанне стылю. Гэта сітуацыя, калі выява з’яўляецца самадастатковай, што яна можа існаваць і без нейкіх дадатковых тэкставых выказванняў і тлумачэнняў. Можна казаць пра спробу інакш паглядзець практычна на ўсё, што звязана з візуальнай культурай. Гэта і экранная культура, а калі разважаем у тэрмінах сацыяльнай камунікацыі, то гэта пра новыя медыя. Карыстальнікі імкнуцца мінімізаваць выкарыстанне тэксту, класічным прыкладам будуць мемы ў Інтэрнэце, дзе патрабуецца разуменне пэўнага кантэксту, веданне культурных тэкстаў і таго, што гэта за практыка. У тым выпадку, калі мы не ў матэрыяле, не ў кантэксце, то мы не здольныя зразумець сэнс гэтага паведамлення. Для значнай часткі моладзі тут няма аніякіх праблем, гэта ўсё прачытваецца, нават без тэксту ў літаральным сэнсе, як стыкеры ў месенджарах і сацыяльных сетках.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Візуальны паварот закранае ўсе магчымыя аспекты працы з візуальнасцю ў сферы культуры, ён «распаўсюджваецца да такіх візуальных практык і сродкаў успрымання, як увага, успамін, зрок, назіранне, так і да культур погляду» [1, с. 395]. Тут будзе дарэчным дадаць, што наш зрок мае як фізіялагічны, так і сацыяльна-культурны падмурак. З аднаго боку, мы маем пэўныя абмежаванні таго спектра, што мы можам бачыць у манахромным і каляровым выглядзе. З іншага – мы выкарыстоўваем безліч культурна дэтэрмінаваных практык, што дазваляюць нам распазнаць пэўныя з’явы, а іншыя пакінуць па-за ўвагай, як нябачныя і няісныя.

Магчыма, што візуальны паварот быў у пэўным сэнсе вымушаным адказам на выбуховы рост колькасці візуальных паведамленняў, што ствараліся новымі сродкамі камунікацыі. Спачатку фатаграфія і кіно, а потым тэлебачанне і Інтэрнэт стварылі і працягваюць ствараць такую колькасць візуальных матэрыялаў, што чалавек не здольны іх асэнсаваць. «Мэтай іканічнага павароту становіцца імкненне даць рады з невычэрпнай плынню вобразаў праз іх крытычны аналіз» [1, с. 399]. Відавочна, што асобнае месца ў гэтым працэсе будзе адводзіцца працы з медыя, дакладней з медыякультурай. І гэта тая самая праблема артэфактаў культуры, калі яны пазбаўляюцца арыгінальнасці і робяцца прыдатнымі для масавай вытворчасці. Гэта той самы «Твор мастацтва ў эпоху яго тэхнічнай узнаўляльнасці» [2], падрабязна канцэптуалізаваны В. Беньямінам.

Тым не менш візуальны паварот не абмяжоўваецца сферай медыя як спробай перакладу ці расшыфроўкі сэнсу візуальных паведамленняў у медыя для сучаснага разумення культуры. З аднаго боку, даследаванні візуальнай культуры займаюць заўважную частку ў навучальных планах тых універсітэтаў, дзе выкладаюць культурныя даследаванні. З іншага – візуальная культура больш аб’ёмная і не абмяжоўваецца выключна медыясферай.

Адзін з прыкладаў – гэта спроба зразумець феномен візуальнасці ў сучаснай культуры, калі даследуюцца не вобразы, а спецыфікі іх перцэпцыі і тое, якім чынам культура вызначае і афармляе тое, што мы лічым візуальным. Тут варта спаслацца на зборнік прац «Даследуя візуальны свет» [3], што складаецца з прац розных часоў Дж. Элкінса. Калі да сферы вывучэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

візуальнай культуры магчыма адносіць і працы з рэпрэзентацыяй нябачнага, пастаноўка і каліброўка культурнай «оптыкі», што дазваляе не заўважаць некаторыя з'явы і інш. Можна падсумаваць, што візуальны паварот змяшчае ўвагу даследчыкаў з вобразаў на перформанс. Візуальная культура шмат у чым перфарматыўна і гэта справядліва не толькі для дынамічных кіно і тэлебачання, але нават для статычных вулічных білбордаў і фота. Перфарматыўнасць у дадзеным выпадку прадугледжвае, што ўзаемадзеянне з візуальнымі аб'ектамі мае працэсуальны характар. Якімі бы словамі мы б не апісвалі дадзены працэс (пільнае назіранне і імгненны позірк, глядзець і бачыць), у любым выпадку – гэта працэс, у якім значная роля належыць назіральніку. Магчыма, што ў тым ліку і гэтым магчыма тлумачыць папулярнасць інтэрпрэтацыйных захадаў да разумення прыроды візуальнага. Не столькі, што аўтар імкнецца паведаміць, колькі хто можа інтэрпрэтаваць гэта больш цікава, незвычайна. А для гэтага патрэбна праца па навучанні «бачыць». Дзеля гэтага з'яўляюцца канцэпцыі розных магчымасцей бачыць свет навокал: позірк, назіранне, спалучанае з кантролем, відовішча як крыніца задавальнення, нахабны гейз і скапафілія.

Тое, што і як мы бачым грунтуецца не столькі на фізіялогіі нашага зроку, колькі на культурна засвоеных практыках. Магчыма разважаць пра візуальную антрапалогію як частку культурнай антрапалогіі.

Візуальная антрапалогія дазваляе працаваць з формамі перцэпцыі вобразаў і дазваляе пазбегнуць рэдукцыі працы з вобразамі да падліку колькасці тых ці іншых вобразаў у медыя. Канешне, кантэнт-аналіз зместу медыя даказаў права на існаванне, але візуальная антрапалогія можа прапанаваць больш змястоўныя версіі тлумачэння працы з вобразамі, чым іх колькаснае прадстаўленне і характар.

Візуальная антрапалогія – гэта не яшчэ адно імя для семіётыкі, што працуе ў тым ліку і з іканічнымі знакамі. Візуальная антрапалогія хутчэй спрабуе паказаць дэтэрмінаванасць наяўнасці вобразаў адпаведнымі культурнымі практыкамі і звязвае фізіялагічную здольнасць бачыць свет з культурным вымярэннем візуальнага. Пошукі адказаў на пытанні хто і што будзе бачыць – вядуць да сферы ўлады і падпарадкавання ў сэнсе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мікрафізік улады М. Фуко. І калі сітуацыя пераносу практык паноптыкума ў сацыяльную сферу ўжо даўно і падрабязна апісана і даследавана, то культура як вобраз, што кідае выклік культуры як тэкст – яшчэ варта асобнага абмеркавання. Напрыклад, сумна вядомыя прыклады канфліктаў вакол карыкатур, што закранаюць пачуцці веруючых. Візуальная антрапалогія, як частка культурнай антрапалогіі, дазваляе зразумець невідавочныя сувязі паміж вобразамі і размеркаваннем сацыяльнага і культурнага капіталу, ці іншымі словамі адсылае да палітыкі вобразаў.

Для самастойнага існавання візуальнай культуры як дысцыпліны бракуе тэорыі. У. Мітчэл прапануе дзесяць міфаў адносна візуальнай культуры, а потым паслядоўна праводзіць іх дэканструкцыю. І ў рэшце рэшт прыходзіць да высновы: «Візуальная культура – гэта візуальная канструкцыя сацыяльнага, а не проста сацыяльная канструкцыя бачання» [4, с. 170]. А што тычыцца тэорыі, то «візуальная культура з'яўляецца асаблівай сферай даследаванняў, фундаментальныя прынцыпы і праблемы якой фармулююцца ў наш час» [4, с. 179]. Магчыма, што 20 год з моманту публікацыі дадзенага артыкула магло і не хапіць, каб сфармуляваць непахісную тэорыю, яна паранейшаму знаходзіцца ў працэсе ўтварэння.

Б. Сарасваці прапануе два магчымыя кірункі для пошукаў тэорыі, што неабходна для візуальнай антрапалогіі: візуалізацыя нябачнага і разуменне візуальнай антрапалогіі як мастацтва. Час і яго модусы (мінулае, сучаснасць і будучыня) не з'яўляюцца ўніверсальнымі для ўсяго чалавецтва на працягу ўсёй гісторыі. Прадстаўнікі традыцыйных культур жылі і працягваюць жыць у рэальным часе бясконцай сучаснасці: «Калі аўстралійскага абарыгена бачаць шпацыруючым, то ён насамрэч падарожнічае назад у часе» [5, с. 22]. Тое, што мы бачым і разумеем час па-іншаму – гэта вынік нашага засваення культурных практык бачання. Хаця гэта асобнае пытанне, як мы можам бачыць час?

Таксама цікавае пытанне з візуальнай антрапалогіі як мастацтва, што паўстае з-за розных варыянтаў разумення таго, чым з'яўляецца творчасць? Ці ёсць адрозненне паміж дзейнасцю мастака і Дэміурга? Можна сказаць, што разуменне візуальнай антрапалогіі як мастацтва – гэта пра стварэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вобраза, што будзе мець агульны сэнс для ўсіх прадстаўнікоў адной культуры. Адным з прыкладаў можа быць знак «+» і яго разуменне для матэматыкаў і хрысціян.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што візуальная культура на сённяшні дзень яшчэ не атрымала прызнаны і бясспрэчны статус самастойнай дысцыпліны і працягвае «змагацца» за ўключанасць у сферу акадэмічных даследаванняў. У выніку візуальнага павароту ў еўрапейскай культуры XX ст. можна казаць пра стварэнне магчымасцей для разумення і пераасэнсавання ролі феномена візуальнасці ў сучасным грамадстве. Гэта пытанне не абмяжоўваецца выключна толькі сферай інтэрпрэтацыі вобразаў, а звяртаецца да візуальнасці як перфарматыўнай практыкі таго, што і як мы бачым. Такім чынам, для культурнай антрапалогіі падрабязнае апісанне назірання ці дзённік даследчыка можа быць дапоўнены, а часам і заменены фота і відэаматэрыяламі, якія замест тысяч слоў фіксуюць культурную практыку.


1. *Бахманн-Медик, Д.* Культурные повороты. Новые ориентиры в науках о культуре / Д. Бахманн-Медик. – М. : НЛО, 2017. – 504 с.

2. *Беньямин, В.* Произведение искусства в эпоху его технической воспроизводимости. Избранные эссе / В. Беньямин. – М. : Медиум, 1996. – 239 с.

3. *Элкинс, Д.* Исследуя Визуальный Мир / Д. Элкинс. – Вильнюс : ЕГУ, 2010. – 534 с.

4. *Mitchell, W.* Showing seeing: A critique of visual culture / W. Mitchell // Journal of Visual Culture. – 2002. – № 2 (1). – P. 165–181.

5. *Saraswati, B.* Toward a Theory of Visual Anthropology / B. Saraswati // The Anthropologist. – 1999. – № 1 (1). – P. 19–24.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ